Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 7. Варыянт 3**

**Білет 7.Практычнае заданне. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х - 1980-ыя гг.**

**Заданні склала:**Гаравіц Наталля Пятроўна, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА "Сярэдняя школа №5 г.Светлагорска"

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Якія галіны прамысловасці развіваліся ў БССР у другой палове 1940–першай палове 1960 гг.?
2. Вызначыце працэс, які сведчыць аб сацыяльна-эканамічных і дэмаграфічных зменах. Дайце яму вызначэнне.
3. На падставе крыніц вызначыце, у якім важным працэсе, звязаным з павелічэннем вытворчасці збожжа ў СССР, бралі ўдзел прадстаўнікі БССР?
4. Аб фарміраванні якога грамадства сведчаць дадзеныя ўсіх прыведзеных крыніц? Вызначце назву грамадства, якая была замацавана ў Канстытуцыі 1977 г. у сферы сацыяльна-эканамічнага і грамадскага развіцця.

**Крыніца I**

| № | Прадпрыемства | Выпускаемая прадукцыя |
|---|---|---|
| 1. | Мінскі аўтамабільны завод | Аўтамабілі-самазвалы МАЗ-205 |
| 2. | Мінскі трактарны завод | Колавыя трактары "Беларусь" |
| 3. | Беларускі аўтамабільны завод у Жодзіне | Самазвалы БелАЗ |
| 4. | Салігорскі калійны камбінат | Калійныя ўгнаенні |
| 5. | Светлагорскі завод штучнага валакна | Кордная нітка |
| 6. | Гродзенскі азотна-тукавы завод | Азотныя ўгнаенні |

**Крыніца II**

«За перыяд 1959–1965 гг. у БССР амаль 2,7 млн. чалавек палепшылі свае жыллёвыя ўмовы за кошт будаўніцтва буйнаблочнага і панэльнага будаўніцтва. У гэтыя гады ў Беларусі з'явіліся новыя добраўпарадкаваныя гарады: Салігорск. Наваполацк, Светлагорск».

**Крыніца III**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Пасведчанне да медаля "За асваенне цалінных зямель"**


А № 616387

УДОСТОВЕРЕНИЕ

В соответствии с Указом Президиума Верховного Совета СССР от 20 октября 1956 года

Мацеров Петр Миронович

от имени Президиума Верховного Совета СССР награжден медалью

„ЗА ОСВОЕНИЕ ЦЕЛИННЫХ ЗЕМЕЛЬ“

От имени Президиума Верховного Совета СССР медаль вручена

**Адказы:**

**1.**Развіццё машынабудавання і нафтахімічнай прамысловасці. Курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці

**2.**Ішоў працэс паляпшэння ўмоў жыцця людзей, перш за ўсё звязаны з забеспячэннем іх жыллём - будаўніцтва «хрушчовак». Будуюцца новыя прамысловыя цэнтры - маладыя гарады. Пачаўся працэс актыўнай урбанізацыі

**3.**Засваенне цалінных і абложных земляў у Казахстане, у якім удзельнічала і моладзь Беларусі

**4.**У другой палове 1940–1960 гг. паступова фарміруецца індустрыяльнае грамадства